М. С. ЧАРНОВА

# С. М. БУЛГАКАЎ АБ ТВОРЧАЙ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦІ Ф. М. ДАСТАЕЎСКАГА

Да нядаўняга часу дзейнасць С. М. Булгакава як літаратурнага крытыка разглядалася толькі ў кантэксце палемік, што на пачатку XX ст. вялі з «адступнікам ад марксізму» А. В. Луначарскі і А. М. Горкі. Апаненты прыкладалі шмат намаганняў, каб даказаць, што выступленні Булгакава ў друку — не што іншае, як «поўны і канчатковы разрыў рускага кадэтызму з дэмакратычным рухам, з усімі яго карэннымі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А...

традыцыямі»[1]. Сёння назіраецца іншая крайнасць. Імёны рэлігійных мысліцелей, і Булгакава ў тым ліку, ператвараюцца ў бясспрэчныя аўтарытэты, а іх меркаванні з'яўляюцца ісцінай ў канчатковай інстанцыі.

Пачатак літаратурна-крытычнай дзейнасці Булгакава датуецца 1901 г., калі разгарнуліся дыскусіі аб патрэбнасцях літаратуры у новым тыпе мастака, здольнага стварыць ідэальны вобраз героя перадрэвалюцыйнай эпохі. У гэтых умовах мастацкая літаратура працягвала заставацца трыбунай для абмеркавання сацыяльна-палітычных і маральна-філасофскіх праблем сучаснасці.

Асаблівая ўвага ў гэтых дыскусіях удзялялася творчасці Ф. М. Дастаеўскага. Менавіта Дастаеўскага крытыкі і публіцысты розных напрамкаў (інтуітывісты, сімвалісты, марксісты) аб'яўлялі роданачальнікам навейшай літаратуры, якая, на іх думку, характарызавалася павышанай цікавасцю да хваравітых бакоў чалавечай псіхікі, містыцызму, адыходам ад складанасці жыцця ў свет падсвядомага. У гэтых спрэчках Булгакаў адстойваў сваю пазіцыю.

У першым выступленні, лекцыі-артыкуле «Іван Карамазаў (у рамане Дастаеўскага «Браты Карамазавы») як філасофскі тып» (1901 г.), Булгакаў разважае аб прыродзе творчасці мастака. Пазней, у працы «Святло невячэрняе» (1917 г.), разважаючы аб сутнасці творчасці, ён зрабіў вывад, што яна ёсць спалучэнне дару геніяльнасці — здольнасці да адкрыцця новых ідэй — і дару таленавітасці — здольнасці выношваць, развіваць, ажыццяўляць гэтыя ідэі[2]. Зыходзячы са свайго азначэння таленту, Булгакаў характарызуе творчую індывідуальнасць Дастаеўскага толькі з боку яго таленту раманіста. На першы план крытык ставіць здольнасць пісьменніка з найбольшай паўнатой вылучаць і ажыццяўляць «ідэі», пытанні глабальныя, што хвалююць разумнага чалавека ва ўсе часы[3]. Пісьменнікам-філосафам назваў Булгакаў Дастаеўскага ў лекцыях «Іван Карамазаў... як філасофскі тып», «Вянец цярновы» (1907 г.), у артыкулах «Праз чвэрць стагоддзя» (1906 г.), «Руская трагедыя» (1914 г.).Ен падкрэсліваў, што найбольш цікавымі ў творах Дастаеўскага з'яўляюцца філасофскія тыпы такога плану, як Іван Карамазаў, Стаўрогін, Шатаў, Кірылаў. Крытык перш за ўсё акрэслівае ролю аб'ектыўных абставін у духоўных пошуках герояў «Братоў Карамазавых» і «Д'яблаў». Духоўны стан, напрыклад, Івана Карамазава вызначаны эпохай, якая нарадзіла «недавер, страту веры ў старое, што не замянілася яшчэ новым». Важна адзначыць, што Булгакаву ўдалося знайсці сувязь духоўных шуканняў герояў Дастаеўскага з духоўнымі пошукамі выдатных розумаў чалавецтва: І. Гётэ, І. Канта, О. Конта, Фр. Ніцшэ. Разам з тым нельга не прызнаць, што, не згаджаючыся з аднабаковымі ацэнкамі пісьменніцкай індывідуальнасці Дастаеўскага, дадзенымі П. Н. Ткачовым, М. К. Міхайлоўскім, В. В. Розанавым, Д. С. Мержкоўскім, сам Булгакаў засяроджваў увагу толькі на філасофскіх аспектах творчасці пісьменніка. Па яго перакананні, Дастаеўскі накіроўваў свой талент на стварэнне не столькі жывога чалавечага характару, колькі «жывога духу», «адцягненай праблемы». «Унутраны мастацкі інстынкт» прымушаў раманіста ўстрымлівацца ад такіх сродкаў, як партрэт, біяграфічныя падрабязнасці і інш., што звычайна выкарыстоўвае мастак, ствараючы адзінкавы характар. У адпаведнасці са сваімі светапогляднымі ўстаноўкамі Булгакаў абстрагуецца ад прыватнага, індывідуальнага, абсалютызуе агульнае, супрацьпастаўляючы Дастаеўскага-мысліцеля Дастаеўскаму-мастаку. Акрамя гэтага, ён бачыў у раманах пісьменніка «неахайнасць архітэктуры», надуманасць некаторых эпізодаў, непатрэбнасць шэрагу персанажаў.

Не быў арыгінальным Булгакаў і ў папроках Дастаеўскаму за недахопы ў мастацкасці. Падобная думка ўсталявалася ў крытыцы розных напрамкаў яшчэ з 70-х гг. Сучасны амерыканскі даследчык Р.-Л. Джэксан называе імя таго, хто першым папракнуў раманіста за тое, што ён «не ўмее так добра пісаць, як Ганчароў, Тургенеў, Талстой »: гэта... сам Дастаеўскі. Джэксан тлумачыць такую самакрытычную заўвагу аўтара «Злачынства і пакарання» і «Братоў Карамазавых» завышанымі крытэрыямі ў адносінах да сябе як да мастака, з аднаго боку, а з другога — усведамленнем свайго творчага метаду, фантастычнага рэалізму, які выводзіў яго за межы традыцый, што склаліся ў рускай літаратуры[4].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Дастаеўскі ніколі не прыдаваў значэння суадносінам зместу твора і яго формы. Аб гэтым сведчаць яго пісьмы, запісныя сшыткі, артыкулы розных гадоў аб літаратуры, уласная мастацкая творчасць.

К канцу XIX ст. у рускай крытыцы не аспрэчвалася значэнне Дастаеўскага як непераўзыдзенага пісьменніка-псіхолага. Аднак публіцысты, звязаныя з вызваленчым рухам, у ацэнцы ролі псіхалагічнага аналізу ў раманах Дастаеўскага зыходзілі з канцэпцыі Міхайлоўскага аб «жорсткім таленце» пісьменніка і папракалі яго ў адсутнасці сацыяльных тлумачэнняў учынкаў і думак герояў.

Разгадваючы ў сваіх творах «тайну чалавека», пранікаючы ў глыбіні чалавечай свядомасці, Дастаеўскі ведаў, што шукае «чалавека ў чалавеку». Ідэйны праціўнік Дастаеўскага П. Н. Ткачоў у артыкуле «Новыя тыпы «забітых людзей», палемізуючы з Міхайлоўскім, менавіта ў гуманістычных імкненнях пісьменніка бачыў моцныя бакі яго мастацкага дару.

Булгакаў не аспрэчвае той відавочны для яго факт, што Дастаеўскі—пісьменнік-псіхолаг і гуманіст. Але і гэтыя бакі таленту тлумачацца ім таксама з пазіцый здольнасці мастака «ажыццяўляць ідэі». У «Вянцы цярновым» крытык адзначаў, што Дастаеўскі ва ўсіх сваіх творах абгрунтоўвае каштоўнасць кожнай асобы, бо ён зыходзіць з прынцыпу роўнасці ўсіх людзей перад Богам[5]. Хрысціянскі сэнс, які ўкладваў Дастаеўскі ў паняцце «гуманізм», дазволіў яму да канца развянчаць у «Злачынстве і пакаранні» «герояў», «напалеонаў», якія прысвойваюць сабе права не толькі на маёмасць, але і на жыццё простых смяротных, —пісаў Булгакаў у артыкуле «Гераізм і падзвіжніцтва»[6].

Асаблівае значэнне, па Булгакаву, маюць тыя грані таленту Дастаеўскага-псіхолага, што дазваляюць раскрываць стан душы чалавека як «жывую непасрэдную рэальнасць», здольную ўспрымаць «апошнія праблемы быцця» і метафізічныя пытанні. Булгакаў не раз падкрэсліваў, што Дастаеўскі ўмеў паказаць складаны працэс пошуку адказаў на гэтыя пытанні. Менавіта здольнасць апісваць гэты працэс, з пункту гледжання Булгакава, склала найважнейшую асаблівасць Дастаеўскага-псіхолага.

Булгакаву, як і галоўным яго апанентам у дыскусіях аб таленце Дастаеўскага, не ўдалося пераадолець метафізічны падыход да праблемы псіхалагізму ў творчасці пісьменніка. У артыкуле «Руская трагедыя» ён зрабіў вывад, што псіхалагічны аналіз у творах Дастаеўскага быў скіраваны на «дасягненне вышэйшых рэальнасцей у сімвалах ніжэйшага свету»[7]. Але ўнутраны свет асобы немагчыма звесці толькі да этычных шуканняў. Ён тысячамі ніцей звязаны са знешнім светам, у якім наканавана жыць чалавеку. Дастаеўскі быў псіхолагам не толькі ў вузкім, але і шырокім сэнсе слова. Застаючыся пісьменнікам зменлівай рэчаіснасці, праз «глыбіні душы чалавечай» ён даследаваў навакольную рэальнасць ва ўсёй яе складанасці, супярэчлівасці, трагічнасці.

Руская крытыка неаднаразова адзначала менавіта трагічны характар творчасці Дастаеўскага. Булгакаў лічыў спрошчанымі меркаванні марксістаў, якія паўтаралі вывад Міхайлоўскага аб тым, што трагічны талент раманіста, пазбаўлены грамадскай значнасці, пераўтварыўся ў балючы і жорсткі. Ён трактаваў «трагічнае» як «нейкі боскі фатум», які здзяйсняе свае прыгаворы, калі парушаецца унутраная заканамернасць чалавечага жыцця[8].

Наўрад ці можна пагадзіцца з Булгакавым, што змест раманаў Дастаеўскага зводзіцца толькі да рэлігійнай праблематыкі, а трагічны талент пісьменніка тлумачыцца яго ўласным духоўным складам. Трагічная супярэчнасць, перажытая Дастаеўскім, — «імкненне да Хрыста і бяссілле быць з ім»[9] — абумовіла змест і сэнс яго твораў. Нягледзячы на кардынальнае адрозненне ацэнак, якія давалі гэтаму баку таленту пісьменніка народнікі, марксісты і Булгакаў, у аснове іх ляжаў суб'ектыўна-псіхалагічны абмежаваны падыход да такой складанай і шматграннай з'явы, як Дастаеўскі. На старонках сваіх твораў ён разважаў пра Бога, пра трагедыю страты чалавекам маральнага абсалюту, але разам з тым ён адлюстроўваў трагічныя супярэчнасці жыцця і быў не толькі трагікам-псіхолагам, але і трагікам-сацыёлагам.

Значным для характарыстыкі творчай індывідуальнасці Дастаеўскага Булгакаў лічыць знойдзены пісьменнікам віртуозны драматычны пры-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ём— «маналог у дыялагічнай форме». Ён дазваляе паказаць раздвоенасць свядомасці персанажа. Варта падкрэсліць, што Булгакаў адзін з першых адзначыў выкарыстанне Дастаеўскім сродкаў драмы для раскрыцця ўнутранага свету герояў. Ён яшчэ ў 1901 г. вельмі блізка падышоў да вызначэння асаблівасці жанру, створанага Дастаеўскім, які ў 1911 г. Вяч. Іваноў назваў раманам-трагедыяй у артыкуле «Дастаеўскі і раман-трагедыя».

Булгакаў, які быў перш за ўсё філосафам, натуральна засяродзіў увагу на адным баку таленту Дастаеўскага — філасофскім. Ад яго і нельга патрабаваць, каб ён змог пераадолець усе ўласцівыя рускай літаратурнай крытыцы абмежаванасці ў ацэнцы Дастаеўскага-мастака.

[1] Ленин В. И. Полн. собр. соч. Т. 19. С. 168.

[2] Гл.: Булгаков С. Н. Свет невечерний. Сергиев Пасад, 1917.

[3] Ён жа. Иван Карамазов (в романе Достоевского «Братья Карамазовы») как философский тип // От марксизма к идеализму. Спб., 1903. С. 85.

[4] Гл.: Jackson R. L. Dostoevsky's Quest for Form. A study of his philosophy of Art. New Heven; London, 1966. P. 49.

[5] Гл.: Булгаков С. Н. Венец терновый (памяти Ф. М. Достоевского). Спб., 1907.

[6] Ён жа. // Вехи. М., 1909. С. 23.

[7] Ён жа // О Достоевском: Творчество Достоевского в русской критике 1881—1931. М., 1990. С. 195.

[8] Там жа. С. 193.

[9] Там жа. С. 135.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Ку